

ЗНАЙСЦІ ВОБРАЗ БАГДАНОВІЧА

6



РЫНАК СМАРТФОНАЎ ЧАКАЕ TESLA

8

10 КРАСАВІКА 2021 г. СУБОТА

№ 67 (29436)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

З першых вуснаў

# «Не з левымі і не з правымі — з народам»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па пытаннях дзейнасці палітычных партый. Сярод яе ўдзельнікаў — кіраўнікі палат парламента, Адміністрацыі Прэзідэнта, дзяржсакратар Савета бяспекі, міністр юстыцыі.**

Унесці ў найбліжэйшы час змены ў Закон «Аб палітычных партыях» дамовіліся на VI Усебеларускім народным сходзе, і, па словах кіраўніка краіны, гэту прававую аснову дзяржава закладвае ў працэсы партыйнага будаўніцтва.

«Я, як і большасць тут прысутных, належу да пакалення, выхаванага Камуністычнай партыяй Савецкага Саюза, якая тады была стрыжнем нашага грамадства. Таму развал СССР і забарона Кампартыі ў былых саюзных рэспубліках многімі былі ўспрыняты як здрада. З прычыны тых узрушэнняў на заранку нашай незалежнасці і будаўніцтва беларускай дзяржаўнасці мы ўсведамляем: кідацца з боку ў бок нельга. ***Я асабіста вывеў для сябе формулу, якой прытрымліваюся да гэтага часу: не з левымі і не з правымі — з народам.*** Магчыма, гэта пасадзейнічала таму, што ў нас не так актыўна развівалася партыйнае будаўніцтва», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, яго пазіцыя ў пытаннях партыйнага будаўніцтва засталася нязменная: не фарсіраваць штучна, але і не тармазіць грамадска-палітычныя працэсы.

***«Яны павінны выспяваць знізу. Ніякіх праўладных партый, штучна створаных для ўтрымання ўлады.*** Хтосьці, магчыма, папракне, што многія гады дзяржава мэтанакіравана не стымулявала развіццё палітычных партый. Але і запыту на іх у грамадства не было. Ён і цяпер не выяўлены», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка і дадаў, што апошнія сацыялагічныя даследаванні сцвярджаюць: узровень даверу да існуючых партый блізкі да статыстычнай хібнасці.



Фота БелТА.

Паводле яго думкі, партыйнае пытанне «бударажыць розумы толькі невялікай часткі палітызаванай публікі ў буйных гарадах», і гэта неабходна ўлічваць.

«У той жа час ***работа дыялогавых пляцовак паказала, што беларусы гатовыя шырэй і больш актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні розных пытанняў.*** Прычым не толькі мясцовага ўзроўню, хоць чалавека хвалюе перш за ўсё тое, што адбываецца ў яго доме, двары, квартале. Мы адчулі гэты запыт», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Ён акцэнтаваў увагу: трэба старанна прадумаць механізм убудавання розных сацыяльных груп у канструктыўны дыялог, задаўшы выразныя рамкі палітычных працэсаў. Любыя крокі ў гэтым напрамку павінны прымацца па прынцыпе «не нашкодзь».

«Трэба разумець: ***у беларускага грамадства практычна няма досведу існавання ва ўмовах шматпартыйнасці. Грамадскі давер і аўтарытэт палітычных партый не могуць узнікнуць раптам з ніадкуль. Гэта доўгачасовы працэс, які ў заходніх краінах развіваўся не адно стагоддзе.*** Таму мы дамовіліся, што, як у гэтым, так і ў іншых пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва, нам разумней ісці эвалюцыйным шляхам з улікам нашай спецыфікі і нацыянальных інтарэсаў», — заявіў Прэзідэнт.

Гатовых рэцэптаў няма, працягнуў Аляксандр Лукашэнка, і прывёў прыклад партыйнай сістэмы заходніх краін, дзе «на месца партыйных ідэалогій прыходзяць танны папулізм і брудныя палітычныя тэхналогіі».

СТАР. 2

# Экіпаж «сямёркі»



Працоўнае месца Святланы ЛУЗІКАВАЙ — Шклоўскае раённае спажывецкае таварыства, а дакладней — аўтакрама, на якой шэсць гадоў жанчына вандруе па раёне, каб і ў самых маленькіх і аддаленых населеных пунктах забяспечыць жыхароў (у асноўным пенсіянераў) неабходнымі таварамі і прадуктамі. Нялёгкая праца экспедытара-прадаўца: кожны дзень — у дарозе, двойчы на тыдзень неабходна аб'ехаць тры зоны, пры гэтым ветліва абслужыць кожнага пакупніка, а галоўнае, каб тавар быў якасны, свежы і своечасова дастаўлены. Болей як у дваццаці вёсках чакаюць аўтакраму нумар сем. Але не за прыгожую лічбу, а за старанне і адданасць сваёй справе прадаўца Святланы. Уявіце сабе, што прадавец ведае не толькі кожнага жыхара і яго пакупніцкія перавагі, — яна яшчэ і патэлефануе, каб нагадаць дакладны час прыезду. Хіба гэта не цудоўная рыса чалавека, які любіць сваю працу?!

Болей за паўсотню найменняў тавараў вязе-спяшаецца для сваіх вяскоўцаў Святланіна «сямёрка», якую мне давялося сустрэць у вёсцы Азер'е. За рулём гэтым разам быў надзейны і пазітыўны Сяргей МАГАЗІНШЧЫКАЎ. Вядома, у абавязкі кіроўцы аўтакрамы таксама ўваходзіць і пагрузка, пра што сведчыць гэты фотаздымак.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена БОГДАН, першы намеснік міністра аховы здароўя:**

*«Нямногія краіны могуць пахваліцца тым, што ў іх медыцынская дапамога, права на ахову здароўя — гэта не толькі канстытуцыйная норма, але і тое, што ажыццёўлена на самай справе. Беларуская сістэма аховы здароўя арыентавана на чалавека, і пацыент не задумваецца аб кошце паслуг, іх даступнасць не залежыць ад сацыяльнага статусу і даходу, у нас шырокія дзяржаўныя гарантыі».*

Дзяржаўны інтарэс

# ТЭХНАПАРКІ: УЧОРА, СЁННЯ І ЗАЎТРА

**3,5 тысячы рабочых месцаў было створана ў 18 навукова-тэхналагічных парках, якія дзейнічаюць у нашай краіне. За 2020 год у тэхнапарках, дзе цяпер зарэгістравана 200 рэзідэнтаў, выпушчана прадукцыі больш чым на 200 мільёнаў рублёў. Для параўнання: у 2016 годзе налічвалася 128 рэзідэнтаў, а аб'ём прадукцыі складаў 77 мільёнаў рублёў. Гэтыя лічбы агучыў падчас круглага стала, які прайшоў у прэс-цэнтры БелТА, начальнік аддзела развіцця інавацыйнай інфраструктуры, камерцыялізацыі і інтэлектуальнай уласнасці Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Андрэй САСНОЎСКІ.**



Фота БелТА.

СТАР. 3

Да адказу

# КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА ПА ФАКЦЕ ГЕНАЦЫДУ

**Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце генацыду насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй ШВЕД, паведаміла БелТА.**

«Беларусь у мінулым годзе сутыкнулася са спробай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам. У адносінах да нашай дзяржавы да цяперашняга часу праводзіцца агрэсіўная палітыка, якая характарызуецца спробамі дэстабілізацыі правапарадку з ужываннем метадаў радыкалізму і розных формаў экстрэмізму. У ходзе расследавання шэрагу крымінальных спраў устаноўлена, што арганізацыя і фінансаванне названых замахаў на суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі ажыццяўляецца некаторымі заходнееўрапейскімі дзяржавамі, датычнымі ў тым ліку да масавага знішчэння беларусаў і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час. Прычым гэтымі ж дзяржавамі разгорнута інфармацыйная вайна, накіраваная і на скажэнне гістарычных падзей, — адзначыў Андрэй Швед. — У мэтах сацыяльнай і гістарычнай справядлівасці, ліквідацыі белых плям гісторыі, умацавання канстытуцыйнага ладу і нацыянальнай бяспекі мною распачата крымінальная справа па факце генацыду насельніцтва Беларусі».



Фота БелТА.

СТАР. 2

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Касмічны карабель «Гагарын» дабраўся да МКС



Транспартны пілатаваны карабель (ТПК «Саюз МС-18»), які названы імем Юрыя Гагарына, адправіўся з 31-й пляцоўкі касмадрома «Байканур» на Міжнародную касмічную станцыю (МКС) напярэдадні 60-годдзя першага палёту чалавека ў космас, паведаміла ТАСС. Збліжэнне з МКС праходзіла па звышхуткай двухвітковай схеме. У сувязі з юбілеем на ашалёўку карабля быў нанесены надпіс «Ю. А. Гагарын», які стаў бачны пасля выхаду апарата ў космас. «Час у шляху» склаў усяго тры гадзіны і 22 хвіліны — ТПК выляцеў у 10.42, а прычаліў да модуля «Світанне» МКС у 14.04 па мінскім часе. Карабель даставіў на арбіту касманаўтаў Раскосмосу Алега Навіцкага (дарэчы, нашага земляка — ураджэнца Чэрвеня) і Пятра Дуброва, а таксама астранаўта NASA Марка Вандэ Хая. Касманаўтам трэба будзе праводзіць модуль «Пірс» і сустрэць на станцыі шматфункцыянальны модуль «Навука». Для падрыхтоўкі яго стыкоўкі ім прыйдзецца здзейсніць некалькі выхадаў у адкрыты космас. Усяго ў рамках экспедыцыі МКС-65 будзе праведзена больш за 50 навуковых даследаванняў і эксперыментаў. Выкананне двух з іх плануецца ў аўтаматычным рэжыме.

## Японія скіне ачышчаную радыеактыўную ваду з «Фукусімы» ў акіян

Кабінет міністраў Японіі прыняў адпаведнае рашэнне, паведаміла агенцтва Kyodo са спасылкай на крыніцу. Урадавая камісія яшчэ летась рэкамендавала зрабіць гэта, аднак рашэнне выклікала шырокую незадаволенасць, у прыватнасці, сярод прадстаўнікоў рыбалоўнай індустрыі, якія асцерагаліся, што спажыўцы будуць адмаўляцца ад морапрадуктаў, вылаўленых у гэтай зоне. Паводле звестак тэлеканала NHK, водныя адходы з «Фукусімы» цяпер захоўваюцца ў спецыялізаваных рэзервуарах, яны ачышчаны, але па-ранейшаму ўтрымліваюць радыеактыўны трыцій. «Крыніцы паведамляюць, што ўрад хоча знізіць узровень утрымання гэтага элемента ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі. І пасля, праз два гады, пачне скідванне вады ў акіян», — адзначаецца ў паведамленні тэлеканала. Як вядома, у сакавіку 2011 года каля паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа Японіі адбыўся землятрус, які выклікаў цунамі. Гіганцкая хваля абрынулася на АЭС «Фукусіма-1», што прывяло да самай маштабнай аварыі падобнага роду з моманту здарэння на Чарнобыльскай АЭС. Паводле даных Нацыянальнага паліцэйскага агенцтва, у выніку стыхійнага бедства ў 2011 годзе загінула 15,9 тысячы чалавек, а 2,5 тысячы дагэтуль лічацца зніклымі без вестак.

## Навукоўцы датавалі фарміраванне сучаснага чалавечага мозга

Міжнародная група навукоўцаў устанавіла, калі ў прадстаўнікоў Homo сфарміраваліся структуры мозга як у сучасных людзей. Аб гэтым паведамілі у Цюрыхскім універсітэце. Адзначаецца, што першыя папуляцыі гэтага роду з'явіліся ў Афрыцы каля 2,5 мільёна гадоў таму, яны ўжо хадзілі на дзвюх нагах, але іх мозг быў удвая меншы, чым у сучасных людзей. «Згодна з нашым аналізам, сучасныя структуры мозга чалавека сфарміраваліся толькі 1,5—1,7 млн гадоў таму ў афрыканскіх папуляцыях Homo», — адзначыў Крыстоф Золікофер з антрапалагічнага інстытута Цюрыхскага ўніверсітэта. Адзначаецца, што каля 1,7 млн гадоў таму культуры ў Афрыцы, як відаць па знаходках розных каменных прылад, сталі больш складанымі і разнастайнымі. «У гэты перыяд, верагодна, развіліся і самыя раннія формы чалавечай мовы», — лічыць аўтар даследавання Марсія Понсэ дэ Леон. Новыя папуляцыі былі надзвычай паспяховымі. Ужо неўзабаве пасля свайго з'яўлення ў Афрыцы яны распаўсюдзіліся на Паўднёва-Усходнюю Азію.

ISSN 1990 - 763X

21067>

9 771990 763008

КОРАТКА

- Тры пункты пропуску на беларуска-літоўскай граніцы адновяць работу з 12 красавіка.
- **Мінскі маторны завод будзе вырабляць рухавікі для вагонаў-рэстаранаў.**
- Каля 20 тысяч саджанцаў хвоі пасадзіў прафсаюзны актыў вобласці ў Гомельскім раёне.
- **У Магілёве плануюць правесці капітальны рамонт пуцеправода на вуліцы Чалюскінцаў.**
- Абмежаванні на лоўлю рыбы з 10 красавіка ўводзяцца ў Віцебскай вобласці.
- **Інфляцыя ў Беларусі ў сакавіку склала 0,7 %.**
- РНПЦ трансфузіялогіі ў сакавіку арганізаваў больш за 1,7 тысячы данацый крыві ў выязных умовах.

*11 красавіка — Міжнародны дзень вызвалення вязняў канцлагераў*

# ГАРОТНАЯ «ПЕСНЯ З БЯРОЗЫ»

**Адзін з самых жорсткіх канцлагераў XX стагоддзя знаходзіўся ў 1930-я ў Бярозе-Картузскай**

**Знакамітыя бярозаўскія чырвоныя казармы сёння выглядаюць даволі прывабна і здольны зацікавіць любога падарожніка. Усё ж узор ваеннай архітэктуры XIX стагоддзя, некалі тут кватараваў 151-ы Пяцігорскі пяхотны полк Расійскай імперыі. Была ў гісторыі казарм і савецкая армейская старонка. Але ж галоўную сваю сумную вядомасць яны набылі з-за перыяду з 1934 да 1939 года, калі сталі месцам канцэнтрацыйнага лагера. І гэтая пяцігодка ўмясціла столькі болю, пакут, што хопіць на сотню гадоў усведамлення.**



### ХУТКА І МОЎЧКІ — ПРАВІЛЫ ЛАГЕРА ІЗАЛЯЦЫІ

**Старшы навуковы супрацоўнік Бярозаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Галіна КРАЎЧУК** заўважае, што гісторыя аднаго з самых жорсткіх канцлагераў XX стагоддзя яшчэ не дастаткова вывучана. Розныя крыніцы называюць ад 8 да 10 тысяч вязняў, якія прайшлі праз засценкі. Маюцца звесткі, што ў апошні год існавання лагера людзей прывозілі і змяшчалі часам нават без дакументальнага афармлення. Некаторыя паперы прапалі. Але і тое, што вядома ды пацверджана архіўнымі матэрыяламі, успамінамі былых вязняў, уражвае, прымушае думаць, разважаць і захоўваць памяць.

У краязнаўчым музеі ёсць пастаянна дзеючая экспазіцыя, якая расказвае пра рэжым утрымання і асаблівасці лагернай сістэмы, якая адрознівалася асаблівай жорсткасцю. Першы камендант лагера Грэфнер казаў так: «З нашага лагера можна выйсці альбо на ўласнае пахаванне, альбо ў дом вар'ятаў». У жыцці вязняў было два асноўныя правілы. Першае — усе загады паліцэйскіх і наглядчыкаў трэба было выконваць хутка і моўчкі. А другое — нельга было размаўляць. Збівалі за любую правіннасць альбо проста так. Як успаміналі былыя вязні, над лагерам заўсёды стаяла цішыня. Не дзіва, што многія паміралі, нямала было і такіх, хто страчваў розум.

СТАР. 5

# «Не з левымі і не з правымі — з народам»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Партыі ўцёмную, несалідна, у парушэнне ўсіх норм і прынцыпаў выкарыстоўваюць у палітычнай барацьбе для дасягнення сваіх карыслівых інтарэсаў асобныя групы. Гэта мы бачым не толькі на Захадзе, але і ў постсавецкіх рэспубліках, якія пайшлі гэтым шляхам, — упэўнены Прэзідэнт. — І інтарэсы часам алігархаў (дзякуй богу, іх няма ў Беларусі) накіраваны не на дабрабыт краіны, а на адкрытае маніпуляванне грамадскай думкай. ***Нельга дазволіць, каб такія спекуляцыі на партыйнай аснове садзейнічалі штучнаму падзелу беларускага грамадства і тым больш страце дзяржаўнасці».***

Партыйнае будаўніцтва, падкрэслівае Аляксандр Лукашэнка, не павінна прывесці да кішэнных партый некалькіх алігархаў, што прасоўваюць свае інтарэсы.

***«У пытаннях партыйнага будаўніцтва разам з забеспячэннем палітычнага прадстаўніцтва розных сацыяльных груп нам трэба перш за ўсё кіравацца пытаннямі бяспекі — кожнага чалавека, грамадства, дзяржавы. Ключавы аспект партыйнага будаўніцтва — адказнасць.*** Прычым на ўсіх ступенях: партыя павінна быць падсправаздачная сваім членам, грамадству і дзяржаве, радавыя члены — партыі, інтарэсам людзей і краіны», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт хацеў бы бачыць у палітычных партыях кузню кадраў, якія гатовы ўзяць на сябе адказнасць за краіну. Самае галоўнае, па яго меркаванні, — ***якой бы ні была розніца ў поглядах на шляхі развіцця краіны, суверэнітэт Беларусі, абарона інтарэсаў народа для ўсіх адказных палітычных сіл павінны стаць безумоўным прыярытэтам.*** Толькі такая партыйная дзейнасць мае права прэтэндаваць на дзяржаўную падтрымку, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асобна Прэзідэнт закрануў тэму фінансавання: як і ва ўсіх развітых дэмакратыях, у Беларусі палітычная дзейнасць катэгарычна не павінна фінансавацца з-за мяжы.

«І нейкія сённяшнія лідары партый думаюць, што іх дзяржава з бюджэту будзе фінансаваць — на гэта таксама разлічваць не трэба. У нас ёсць, куды дзяржаўныя рэсурсы накіроўваць», — дадаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў нормы дзеючага заканадаўства ў сферы замежнага фінансавання партый.

«Кожнаму, хто разлічвае на тое, што «замежжа нам дапаможа», дасць грошай на «сацыяльны ліфт», на нябеднае жыццё, варта раз і назаўжды зразумець: ***прыняў грант, грошы замежнага фонду, пагадзіўся на аплату паездак, нейкіх іншых паслуг — адразу ж дэ-юрэ і дэ-факта страціў права займацца палітыкай, прэтэндаваць на дзяржаўныя і выбарныя пасады ў Беларусі.*** І трэба ўзмацніць, каб гэта фактычна прывяло да ліквідацыі такой партыі», — заявіў Прэзідэнт.

Закон, які рэгулюе дзейнасць палітычных партый, павінен забяспечваць вырашэнне ўсіх пытанняў, якія ёсць і будуць, мяркуе кіраўнік краіны. Прэзідэнт папярэдзіў распрацоўшчыкаў дакумента: калі дапусцяць памылку ў фарміраванні партый, спасылаючыся на замежны вопыт, краіну знішчаць.

«Так, ёсць запыт часткі эліты, ігнараваць яго нельга. Мабыць, партыі ў рэчышчы закона з рознымі меркаваннямі (праўладныя, апазіцыйныя) — нармальны працэс. Але мы павінны ўсё спачатку абставіць, выпрацаваць сур'ёзны закон аб партыях, каб потым не куляцца і не спачуваць, што пайшлі не тым шляхам», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту падчас нарады далажылі, што ўжо зроблена ў палітычным будаўніцтве, якія ёсць праблемы і што неабходна зрабіць для павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага і грамадскага развіцця.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ** пасля нарады расказаў журналістам, што праект закона аб палітычных партыях быў тэмай дыскусій шматлікіх сустрэч і на нарадзе кіраўніку краіны прадставілі падыходы да яго карэкціроўкі.

«Абмяркоўвалася тэматыка пашырэння значнасці палітычных партый з улікам членства ў рэгіёнах. Прапануецца разгледзець пытанне, каб партыі былі больш прадстаўлены за кошт рэгіёнаў. Разглядаецца пытанне адносна мінімальнай колькасці членаў партыі. Не выключана, што парог у 1000 членаў будзе павялічаны», — сказаў міністр.

Па яго словах, праект закона дапоўняць нормамі, што датычацца павышэння празрыстасці дзейнасці партыі. Па аналогіі з грамадскімі аб'яднаннямі ўстановяць штогадовае інфармаванне грамадскасці аб расходаванні маёмасці і сродкаў партыяй. Плануецца абмежаваць суму фінансавання партый адной арганізацыяй ці асобай.

«З мэтай павышэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі праектам закона прадугледжваецца абмежаванне тэрмінаў паўнамоцтваў кіруючых органаў і кіраўнікоў палітычных партый — не больш за чатыры гады. Гэтыя паўнамоцтвы могуць працягвацца, калі на сходзе партыі будзе прынята адпаведнае рашэнне. Але перыядычнасць унутрыпартыйных выбараў павінна быць не радзей чым адзін раз у чатыры гады», — паведаміў Алег Сліжэўскі.

Адна з задач партыі — вылучаць сваіх членаў да ўдзелу ў выбарах. Так, па даных міністра, на выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у апошнюю кампанію з 15 партый вылучылі кандыдатаў 12, а на папярэдняй — увогуле толькі дзевяць партый.

«Асобныя партыі на працягу многіх выбарчых цыклаў не ўдзельнічаюць у выбарах шляхам вылучэння сваіх кандыдатаў. У гэтай сувязі для стымулявання партый прапаноўваецца замацаваць у праекце закона норму, што няўдзел палітычнай партыі ў вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на працягу дзвюх выбарчых кампаній запар можа стаць падставай для ліквідацыі палітычнай партыі», — сцвярджае кіраўнік ведамства.

Усе гэтыя меры павінны, на думку міністра, падштурхнуць партыі да актывізацыі работы з грамадзянамі, прычым не толькі ў буйных гарадах, але і раёнах. Па словах Алега Сліжэўскага, закон яшчэ ў распрацоўцы, але ўжо сёння партыям неабходна задумацца над зменамі — павелічэнні колькасці членаў і арганізацыйных структур у рэгіёнах.

Наконт магчымасці за мяжой стварыць беларускую партыю міністр нагадаў: па існуючым законе заснавальнікамі могуць быць толькі грамадзяне Беларусі. А праектам новага закона прадугледжана, што стварыць палітычную партыю могуць грамадзяне, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі краіны. «Магчыма, такая норма будзе прымяняцца не толькі да заснавальнікаў партыі, але і да яе членаў. Нармальная і міжнародна прынятая практыка, калі палітычная партыя як арганізацыя, якая ўдзельнічае ў фарміраванні органаў улады, не атрымлівае фінансавання з-за мяжы і іншым чынам не падвяргаецца ўздзеянню з-за мяжы», — рэзюмаваў Алег Сліжэўскі.

# КРЫМІНАЛЬНАЯ СПРАВА ПА ФАКЦЕ ГЕНАЦЫДУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як заўважыў генеральны пракурор, у аснову прынятага рашэння пакладзены звесткі аб гібелі мільёнаў беларусаў і іншых асоб з прычыны зверстваў нямецкіх акупантаў і іх памагатых. «Акрамя таго, грамадскасць недастаткова дасведчаная аб шэрагу фактаў генацыду, учыненых нацыяналістычнымі бандфарміраваннямі саўдзельнікаў фашыстаў. Гэта ў сваю чаргу стварае глебу для іх гераізацыі і спроб разбурыць каштоўнасці, на якіх будуецца беларуская дзяржаўнасць. Беспакаранасць спараджае новыя злачынствы. Узбуджэнне крымінальнай справы па фактах злачынстваў у дачыненні да мірнага насельніцтва Беларусі — важны этап у супрацьдзеянні рэабілітацыі нацызму. Пры гэтым Канвенцыя ААН па папярэджанні злачынстваў генацыду і пакаранняў за яго ўстанавіла, што асобы, абвінавачаныя ў здзяйсненні генацыду, павінны быць судзімыя кампетэнтным судом дзяржавы, на тэрыторыі якой было здзейснена дадзенае дзеянне. Генацыд не мае тэрміну даўнасці», — адзначыў Андрэй Швед.

Распачаты Генпракуратурай крымінальны працэс па расследаванні фактаў генацыду дазволіць устанавіць канкрэтных асоб з ліку нямецкіх захопнікаў і іх памагатых, якім удалося пазбегнуць адказнасці за забойства мірных жыхароў, здзекі і катаванні ў канцлагерах і гета, масавы вываз грамадзянскага насельніцтва ў нямецкае рабства.

«Вінаватыя ў генацыдзе, якія жывуць цяпер, павінны панесці заслужанае пакаранне. Імёны памерлых ваенных злачынцаў павінны быць агучаны. У межах крымінальнай справы пракуратура рэалізуе паўнамоцтвы, прадугледжаныя пагадненнямі аб аказанні міжнародна-прававой дапамогі, у тым ліку па вышуку, допыце і магчымай выдачы абвінавачаных», — падкрэсліў Андрэй Швед.

У следчай групы наперадзе вялікая работа з архіўнымі дакументамі, тысячамі крымінальных спраў у дачыненні да нацысцкіх злачынцаў. Будзе праведзена мноства экспертных даследаванняў, звязаных з выяўленнем масавых пахаванняў, працягнуты мерапрыемствы па вызначэнні жывых сведак генацыду, абароне іх правоў і законных інтарэсаў, увекавечанні памяці загінулых.

«Ужо цяпер у Генеральную пракуратуру паступаюць звароты грамадзян, чые родныя сталі ахвярамі нацыстаў і іх памагатых з просьбай расследаваць факты забойстваў і зверскага стаўлення да беларусаў. У сувязі з гэтым я звяртаюся да ўсіх грамадзян Беларусі і іншых краін з просьбай накіроўваць нам звесткі, матэрыялы, заявы пра факты генацыду іх родных і блізкіх у названы перыяд часу. Гэта неабходна ў мэтах устанаўлення аб'ектыўнай праўды па справе аб роўным прызнанні нашчадкаў загінулых пацярпелымі для рэалізацыі іх правоў і законных гарантый. Таксама інфармуем, што падчас расследаванняў плануецца правядзенне пошукавых мерапрыемстваў, у тым ліку раскопак у месцах масавага знішчэння насельніцтва. Уяўляецца неабходным прыцягнуць да супрацоўніцтва са следчай групай розныя ведамствы і грамадскія арганізацыі, а таксама патрыятычны маладзёжны і валанцёрскі рух», — дадаў генпракурор.

Звесткі з крымінальнай справы дазволяць паставіць перад міжнароднымі арганізацыямі пытанне аб прызнанні Беларусі пацярпелай ад генацыду, спыніць спробы абясцэніць гістарычныя факты. Вынікі расследавання будуць пакладзены ў аснову ідэалагічнай вучэбна-выхаваўчай і інфармацыйнай работы. Для таго каб праз разуменне гісторыі зберагчы пераемнасць паміж пакаленнямі і памяць народа, вывучэнне генацыду беларускага народа варта ўпісаць ва ўсе абавязковыя адукацыйныя праграмы.

Генпракуратура Беларусі звернецца ў Нюрнберг пры расследаванні справы аб генацыдзе насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны, заявіў Андрэй Швед. «Сутнасць гэтага расследавання і прадмет, вядома, у першую чаргу маюць на ўвазе неабходнасць звароту ў кампетэнтныя органы шэрагу дзяржаў з просьбай аказання прававой дапамогі. Аб'ектыўна мы разлічваем на аператыўную і паўсядзённую дапамогу ведамстваў і архіваў Расіі, дзе, па нашых звестках, сабрана і маецца шмат дакументаў пра генацыд беларусаў і іншых асоб, якія пражывалі на тэрыторыі БССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Вядома, мы звернемся па дапамогу да ведамстваў і ўстаноў ФРГ, у прыватнасці, там ёсць універсітэты, якія ў свой час займаліся расследаваннем фактаў генацыду на тэрыторыі БССР, — сказаў Андрэй Швед. — Адпаведна, мы звернемся з запытам у Нюрнберг з просьбай атрымаць доступ да матэрыялаў Нюрнбергскага працэсу, для таго каб вылучыць тыя звесткі і доказы, якія звязаны з Беларуссю. Вядома, ёсць неабходнасць накіраваць даручэнні аб аказанні дапамогі ў такія краіны, як Літва, Польшча і шэраг іншых дзяржаў».

Генпракуратура будзе ставіць пытанне аб выдачы ваенных злачынцаў для адкрытага суда ў Беларусі, заўважыў генпракурор. «Мы будзем і ўжо пачалі вывучаць вопыт работы міжнародных трыбуналаў і інстытутаў у сувязі з падрыхтоўкай матэрыялаў у міжнародныя арганізацыі аб прызнанні генацыду беларусаў і іншых асоб на тэрыторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час. Гэта адзін з кірункаў, па якім будзе працаваць следчая група, — сказаў Андрэй Швед. — У далейшым з улікам міжнароднай практыкі і міжнароднага права мы, вядома, будзем прызнаваць усіх, хто на гэта будзе мець права, пацярпелымі па крымінальнай справе. Адпаведна патрабаваць абароны іх правоў і законных інтарэсаў, магчыма, і кампенсацыі».

Асобны кірунак — гэта, вядома, складанне спісаў усіх памерлых і злачынцаў, якія жывуць цяпер. «У адносінах да апошніх мы будзем збіраць матэрыялы з просьбай правядзення працэсуальных дзеянняў у дачыненні да гэтых асоб на тэрыторыі тых дзяржаў, дзе яны пражываюць, і ставіць пытанне аб іх выдачы для адкрытага суда на тэрыторыі Беларусі. Альбо рыхтаваць матэрыялы для прыцягнення гэтых асоб у міжнародных інстанцыях, трыбуналах, якія расследавалі, разглядалі раней крымінальныя справы ў дачыненні да ваенных злачынцаў», — адзначыў генпракурор.

### Стала вядома

## У Беларусі асуджана больш за 70 неанацыстаў

«Мы ў рамках выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы па стабілізацыі грамадскай бяспекі паставілі пытанне: а што легла ў аснову дзеянняў тых, хто здзяйсняе радыкальныя, экстрэмісцкія, ды і ўжо тэрарыстычныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Тады з'явіліся першыя звесткі ў рамках расследавання крымінальных спраў аб тым, што фінансаванне дзейнасці такіх асоб ажыццяўляецца з-за мяжы. Сёння гэтая інфармацыя пацвярджаецца па многіх крымінальных справах», — паведаміў Андрэй Швед.

Генпракурор звярнуў увагу, што стаўка рабілася ў тым ліку на неанацысцкія плыні і групы. «Летась 88 адміністрацыйных матэрыялаў было складзена ў сувязі з неанацысцкімі ўчынкамі і дзеяннямі. Гэта ў 12—14 разоў больш за ўсе папярэднія гады. Далей супаставілі склад тых асоб, якія здзяйсняюць радыкальныя дзеянні. Сярод ужо асуджаных 72 — гэта адкрытыя неанацысты, — адзначыў Андрэй Швед. — Дзейнасць гэтая была накіравана і на гераізацыю нацыстаў, якія здзяйснялі тут свае злачынствы. У прыватнасці, ужо прадстаўлены факты, што на працягу многіх гадоў на тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей праз дзейнасць асоб, якія фінансаваліся з Польшчы, праводзіліся мерапрыемствы па рэабілітацыі палякаў, якія здзяйснялі зверскія дзеянні на тэрыторыі Беларусі пад сцягамі так званай Арміі Краёвай».

Андрэй Швед падкрэсліў, што крымінальная справа аб генацыдзе дазволіць падняць увесь пласт гістарычнай праўды і ў далейшым спыніць на корані падобныя акты і спробы.

### Тым часам

# Дзеля захавання памяці

**Штогод байцы Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» падводзяць вынікі не толькі сваіх палявых, але і даследчых работ. Найлепшыя з іх уваходзяць у адзіны ў краіне ваенна-гістарычны зборнік — «Магілёўскі пошукавы веснік», адзінае ў краіне падобнае выданне. Іх аўтары — пошукавікі, журналісты, гісторыкі або проста аматары гісторыі. Летась прэзентаваць зборнік перашкодзіла пандэмія. Гэтым разам традыцыю было вырашана не парушаць. Прэзентацыя адбылася ў сценах абласной бібліятэцы. Тут паклапаціліся падрыхтаваць выстаўку і музычна-літаратурную кампазіцыю на ваенную тэматыку.**

— Мы заўсёды рады бачыць у сябе ў гасцях людзей, якія займаюцца такой важнай справай, — адзначыла **намеснік дырэктара Магілёўскай абласной бібліятэкі Вольга ЧУМАКОВА.** — Гэта наша памяць, наша мінулае, якое нельга забываць. Усе зборнікі «Магілёўскага пошукавага весніка» ёсць у нашых фондах, яны карыстаюцца вялікім попытам у чытачоў.

У 13-м па ліку зборніку размешчана ўсё самае новае і цікавае, што датычыцца ваенных дзеянняў на тэрыторыі Магілёўскай вобласці, а таксама вынікі работы пошукавікаў, успаміны жыхароў. Матэрыялы падмацаваныя копіямі арыгінальных баявых дакументаў з Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі. Успаміны відавочцаў, нямецкія аэрафотаздымкі, пошукавыя экспедыцыі, работа з электроннымі базамі даных і ў архівах — усё робіцца для таго, каб вярнуць з небыцця імя яшчэ хоць бы аднаго абаронцы і вызваліцеля.



— Найбольш цікавыя ў зборніку матэрыялы кандыдата гістарычных навук Барыса Сідарэнкі, якія датычацца рэформаў арміі ў другой палове XIX стагоддзя, — адзначае **кіраўнік гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Згаданыя рэформы дагэтуль уплываюць на наша жыццё, а па некаторых з іх мы жывём і дагэтуль. Ужо не першы раз размяшчаем матэрыялы расійскага публіцыста Сяргея Мачынскага, які вельмі ўважліва ставіцца да пошукавай дзейнасці і піша кранальныя артыкулы на гэтую тэму. Не менш цікавыя матэрыялы расіяніна Рыгора Плахатнюка па 1941 годзе. Зборнік, дарэчы, цалкам прысвечаны 75-годдзю Перамогі. Хоць калі ёсць новыя, нязбітыя матэрыялы па Першай сусветнай вайне, 1812 года, Паўночнай вайне, мы іх таксама публікуем. Але тут зрабілі выключэнне.

Значнае месца ў чарговым выпуску «Магілёўскага пошукавага весніка» займаюць работы навучэнцаў, якія датычацца даследчай і пошукавай дзейнасці па тэме вайны. Прычым найлепшыя з іх, з вельмі цікавай фактурай. Усе яны — пераможцы розных конкурсаў.

— Як кіраўнік установы дадатковай адукацыі ганаруся, што ў зборніку ёсць работы юных пошукавікаў і краязнаўцаў, — адзначыў **дырэктар Магілёўскага абласнога Цэнтра творчасці Сяргей ІВАНОЎ.** — Каштоўна не тое, што яны ўзялі гэтыя звесткі з нейкіх там інфармацыйных крыніц, а тое, што яны самі былі на месцы раскопак або прысутнічалі пры перапахаванні. Калі дзеці такое бачаць і прапускаюць праз сябе, гэта зусім іншае. Гэта і ёсць той самы сапраўдны патрыятызм, які мы жадаем выхаваць у нашых нашчадкаў.

Адна з малавядомых старонак Вялікай Айчыннай вайны — штрафнікі. І не вельмі шмат у Беларусі гісторыкаў, якія працуюць над гэтай тэмай. У зборніку ёй прысвечаны артыкул **члена савета гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» Сяргея БЯСПАНСКАГА.**

— Гэта менавіта тыя штрафныя падраздзяленні, якія бралі ўдзел у вызваленні Магілёўшчыны, — адзначыў ён. — У маім дакладзе размова ідзе пра 11-ы штрафны батальён 10-й арміі, які ваяваў з восені 1943-га да красавіка 1944-га. Ён быў расфарміраваны, але памяць афіцэраў, якія загінулі, была ўвекавечана ў Чавускім раёне памятным знакам. Хацелася б яшчэ зрабіць помнік падраздзяленням Чырвонай Арміі, якія ўдзельнічалі ў 1943—1944 гадах у вызваленні Магілёва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

**Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»**

Минский городской центр недвижимости

**18 мая 2021 г. проводит открытый аукцион № 02-НС-21 по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).

**Предмет аукциона:** не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом и земельный участок, необходимый для обслуживания не завершенного строительством жилого дома.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Вид вещного права на земельный участок: частная собственность.

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка/ назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Описание не завершенного строительством жилого дома, его составных частей и принадлежностей | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома о проведении аукциона и предоставлении земельного участка и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск ул. Дисенская, 15 | 623687806601000590 | 0,1010 | для строительства и обслуживания жилого дома по ул. Дисенской, 15 в г. Минске/ земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания | 187 039,86 (в том числе: начальная цена земельного участка площадью 0,1010 га – 149 267,9; начальная стоимость не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома в соответствии с оценочной стоимостью – 37 771,96 руб. | 28 000,00 | Фундамент – монолитный железобетонный. Наружные и внутренние стены – ячеистобетонные блоки, перекрытия – сборные железобетонные плиты (перекрытия фундамета), перегородки, крыша, полы, окна, двери – отсутствуют. Степень готовности – 25 %. Физический износ конструкций составляет 4 % | Обязательства победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона определены пунктом 5 решения Мингорисполкома от 01.04.2021 № 1009* |

*в том числе:

в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией возникновения права частной собственности на предмет аукциона;

в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в администрацию Советского района г. Минска для получения разрешительной документации на продолжение строительства объекта;

в течение одного года со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок и утверждения в установленном порядке разрешительной и технической документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка в соответствии с его целевым назначением;

в течение трех лет со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок в установленном порядке завершить строительство жилого дома;

использовать земельный участок в соответствии с целью и условиями его предоставления и иные условия.

Инженерные коммуникации на указанном земельном участке отсутствуют.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **18 мая 2021 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь и негосударственные юридические лица Республики Беларусь. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более граждан, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 12 мая 2021 г.** в размере, указанном в графе 7 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные гражданами, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 2, 6, с 15 апреля 2021 г. по 12 мая 2021 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, либо для участия в нем явился только один участник, аукцион признается несостоявшимся и предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки внесения платы за земельный участок);

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

**Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под подпись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за земельный участок.

После внесения платы за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки внесения платы за земельный участок), Минский горисполком передает ему выписку из решения о проведении аукциона и предоставлении земельного участка, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 363-96-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Кидма тек», Витебская область, Оршанский район, Устенский с/с, аг. Устье, 5/1** |
| **Предмет электронного аукциона: транспортное средство, бывшее в употреблении** | |
| **Грузовой седельный тягач RENAULT MASCOTT** 150.35., 2008 г. в., инвентарный номер 00000204, расположенный по адресу: СТО «ЭкспертТехСервис», г. Минск, ул. Радиальная, 58 | **Начальная цена с НДС 20 %:** 17 880,00 белорусского рубля |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** Начало торгов: 10.00 12.05.2021 г. Окончание торгов: 12.00 12.05.2021 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.05.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

Полное наименование и местонахождение акционерного общества – **«Приорбанк» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31а;**

дата принятия решения общего собрания акционеров, в соответствии с которым осуществляется выплата дивидендов по акциям, – **30 марта 2021 года;**

дивиденды, начисленные на одну акцию (указывается по простым и привилегированным акциям (типам привилегированных акций) – **по привилегированным акциям, – 35 копеек**;

срок и порядок выплаты дивидендов по акциям – **выплату дивидендов начать не позднее 06 апреля 2021 года на счета акционеров, без открытия счета – в случае наличия соответствующего заявления.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.07.2019 года. УНП 100220190.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** ***(Организатор аукциона)*** **по поручению открытого акционерного общества «СОЛИГОРСКВОДСТРОЙ»** ***(Продавец)*** **проводит открытый аукцион**

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ КОТЕЛЬНОЙ**

***(составные части и принадлежности: пристройка),*** **инв. № 643/С-15192, общей площадью 519,9 кв. м, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003228** *(право аренды по 27.10.2119)* **площадью 0,3757 га по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Боровика 46/9.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **162 201,60** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **16 220,16** бел. руб.).

**Объекты находятся под запретом совершения регистрационных действий. Запрет будет снят после произведения оплаты на расчетные счета Министерства юстиции Республики Беларусь и Министерства финансов Республики Беларусь.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **14.05.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.05.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 8 (029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: 8 (029) 390 18 06.**

УНН 600028496

УНП 190398583

**Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» сообщает о внесении следующих изменений в извещение (информацию) о проведении 27 апреля 2021 года торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир) и машино-мест, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат» (опубликовано в газете «Звязда» 23.03.2021):**

предметы торгов №№ 1, 2, 3 исключаются из текста публикации в связи с отказом продавца от проведения торгов.

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22. Адрес в сети интернет: www.mgcn.by.

# ТЭХНАПАРКІ: УЧОРА, СЁННЯ І ЗАЎТРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Усяго за пяцігодку ў тэхнапарках атрымана прадукцыі больш чым на 700 мільёнаў рублёў. «2020 год быў хоць і складаны, але паспяховы. Інвестары разумеюць, што нават у няпросты час укладацца ў інавацыйныя прадпрыемствы перспектыўна і важна для эканомікі краіны», — падкрэсліў Андрэй Сасноўскі.

Паводле яго слоў, у тэхнапарках магчымая любая навуковая, навукова-вытворчая і інавацыйная дзейнасць. Некаторыя з іх спецыялізуюцца на канкрэтных кірунках, напрыклад біятэхналогіях. Дзейнічаюць таксама акселерацыйныя альбо інжынерныя тэхнапаркі, якія збіраюць вакол сябе перспектыўныя малыя інавацыйныя прадпрыемствы і дапамагаюць ім пашыраць аб'ёмы вытворчасці прадукцыі і ствараць рабочыя месцы. У краіне ёсць і ўніверсітэцкія навукова-тэхналагічныя паркі, у якіх у тым ліку рэалізоўваюцца праекты выпускнікоў ВНУ. Тэхнапаркі створаны на базе БДУ, БНТУ, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках. У найбліжэйшы час плануецца рэгістрацыя новага тэхнапарка ў БДУІР.

У Магілёўскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях дзейнічае па два тэхнапаркі, у Брэсцкай, Мінскай, Віцебскай абласцях і Мінску — па тры. У планах — павялічваць іх колькасць. Чакаецца, што тэхнапаркі з'явяцца ў Лідзе, Оршы, Бабруйску, Маладзечне і Кобрыне. «Ёсць планы не толькі па тэхнапарках, але і ў цэлым па суб'ектах інавацыйнай інфраструктуры. Іх павінна быць не менш як 29 да канца пяцігодкі. Гэта значыць, трэба ствараць і цэнтры трансферу тэхналогій, і венчурныя фонды. Таксама чакаем ад тэхнапаркаў і іх рэзідэнтаў амаль 1 мільярд выручкі і тысячу новых рабочых месцаў», — праінфармаваў Андрэй Сасноўскі.

**Дацэнт кафедры дзяржаўнай эканамічнай палітыкі Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Ірына МАЛЬГІНА** лічыць, што тэхнапаркам неабходна аб'яднацца ў асацыяцыю. «Нашы тэхнапаркі не павінны прабівацца на міжнародныя пляцоўкі паасобку. Мэтазгоднае стварэнне цэнтралізаванай асацыяцыі, якая б абараняла інтарэсы тэхнапаркаў у органах дзяржкіравання, дапамагала рэзідэнтам выходзіць на міжнародную арэну. Ідэя такой асацыяцыі ўжо была апрабаваная ў 2001 годзе. Можа, магчыма гэта паўтарыць. Акадэмія кіравання гатовая забяспечыць сваю метадалагічную і экспертную дапамогу», — заявіла яна.

На думку Ірыны Мальгіной, функцыянаванне тэхнапаркаў — важны элемент дзяржаўнай палітыкі ў сферы развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і інавацый. «Каб навукова-тэхналагічныя паркі развіваліся, паміж імі павінна быць канкурэнцыя. Таксама важны прыток інавацыйнага бізнесу ў тэхнапаркі, цэнтры прататыпіравання», — звярнула ўвагу яна.

Андрэй Сасноўскі таксама лічыць, што пытанне стварэння асацыяцыі ўжо наспела: «Думаю, сёлета мы збяром круглы стол з усімі тэхнапаркамі і будзем абмяркоўваць гэтае пытанне. Навукова-тэхналагічных паркаў ужо нямала, у гэтым годзе будзе зарэгістравана яшчэ некалькі, так што ёсць магчымасці для фінансавання асацыяцыі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзь у курсе!

# ЦЯГНІКОЎ У РАСІЮ СТАЛА БОЛЬШ

**Беларуская чыгунка ва ўзаемадзеянні з ААТ «Расійскія чыгункі» працягвае работу па паэтапным аднаўленні міжнародных пасажырскіх зносін паміж дзвюма краінамі.**

Так, як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, з 13 красавіка фірменны хуткі цягнік «Беларусь» № 2/1 Мінск — Масква фарміравання Беларускай чыгункі будзе курсіраваць штодзённа.

Таксама з 13 красавіка аднаўляе рух цягнік № 52/51 Брэст/Мінск — Санкт-Пецярбург фарміравання Беларускай чыгункі адпраўленнем з Брэста ў 14.30 (з Мінска ў 18.44) і прыбыццём у Санкт-Пецярбург у 7.55. З Санкт-Пецярбурга цягнік адправіцца ў 18.23 і прыбудзе ў Мінск у 7.15, а ў Брэст — у 11.56. Цягнік будзе курсіраваць штодня.

Акрамя гэтага, з 13 красавіка пачне курсіраваць цягнік № 4/3 Масква — Брэст фарміравання Беларускай чыгункі адпраўленнем з Брэста ў 17.37 па няцотных чыслах і прыбыццём у Маскву ў 6.53 па цотных чыслах. З Масквы цягнік будзе адпраўляцца ў 22.17 па цотных чыслах і прыбываць у Брэст у 10.31 па няцотных чыслах. Цягнік будзе курсіраваць праз дзень, пры сумежных чыслах 31 і 1: з Брэста — 29, 1, 3, з Масквы — 30, 2, 4.

**Чарговы раз уся Беларусь пачуе і падхопіць гэтую ўрачыстую песню падчас юбілейнага XX Нацыянальнага фестывалю песні і паэзіі «Маладзечна-2021». Чарговы раз беларуская музыка і беларускае слова падораць нам свята. Таленавітыя артысты, кампазітары, літаратары і іх прыхільнікі сустрэнуцца 11 і 12 чэрвеня. Аб ходзе падрыхтоўкі да творчага форуму і яго праграме расказалі арганізатары мерапрыемства на нядаўняй сустрэчы з журналістамі.**

— Цэнтральнай падзеяй першага дня фестывалю стане традыцыйна Конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні, — зазначыла **кансультант упраўлення прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Людміла МАНАКОВА.** — Па выніках рэгіянальных і абласных этапаў праслухоўванняў у рамках фестывалю 11 чэрвеня пройдзе заключны другі і трэці этапы конкурсу, у якіх возьмуць удзел 21 канкурсант з ліку найлепшых маладых выканаўцаў з усіх абласцей краіны і горада Мінска. Гэтае творчае спаборніцтва выконвае ганаровую місію па папулярызацыі творчасці сучасных беларускіх паэтаў, кампазітараў і эстрадных артыстаў.

Асноўнымі акцэнтамі творчага форуму стануць тэмы гісторыі і развіцця фестывалю, а таксама Год народнага адзінства.

— Мы разумеем, што сёлетні фестываль юбілейны, і таму, на наш погляд, ён павінен быць асаблівым, паказаць найлепшыя традыцыі, найлепшых людзей у беларускай паэзіі і музыцы, — дзеліцца **начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Ала ШАХОЦЬКА.** — Прадугледжаны творчыя сустрэчы з беларускім паэтамі. Пакажа свой спектакль абласны драматычны тэатр. Па запрашэнні аблвыканкама прывязуць новую пастаноўку «Паўлінкі» Купалаўскага тэатра.

Канцэрт адкрыцця будзе прысвечаны юбілею беларускага кампазітара, піяніста Ігара Паліводы, якому ў маі споўнілася б 80 гадоў. Яго імя адметнае яшчэ і тым, што менавіта ён аўтар гімна «Маладзечна», які выконваюць разам артысты і гледачы падчас кожнага фестывалю. Пачуем таксама песні на вершы Уладзіміра Караткевіча.

У ходзе канцэртнай праграмы пройдзе ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу маладых выканаўцаў. Завершыць праграму другога дня гала-канцэрт рэжысёра, мастацкага кіраўніка Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіславы Арцюкоўскай. Варта таксама адзначыць, што 13 чэрвеня ў Вялікай зале Палаца культуры горада Маладзечна своеасаблівым працягам фестывалю стане (робіцца гэта ўпершыню) канцэртная праграма Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», прысвечаная 80-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна.

Канцэрт закрыцця плануюць правесці ў «сямейным» фармаце, калі на сцэне будуць прысутнічаць паэты-песеннікі, кампазітары, артысты, і такім чынам аўдыторыя згадае самыя яркія падзеі фестывалю з першых вуснаў.

— Мы ганарымся тым, што ў 1993 годзе менавіта Маладзечна стала пляцоўкай для правядзення Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. З таго часу фестываль з'яўляецца адным з самых знакавых і чаканых падзей не толькі ў нашым горадзе, але і ў найбліжэйшых рэгіёнах, — гаворыць **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечанскага райвыканкама Вольга КЛЕПАКОВА.** — Разам з традыцыйнымі мерапрыемствамі, без якіх фестываль нельга ўявіць, ёсць і некаторыя навінкі ў сёлетняй фестывальнай праграме. Так, упершыню за ўсю гісторыю форуму будзе прадстаўлены арт-праект «Фестывальны шлях», які змесціць 117 банераў на металічнай агароджы парку па вуліцы Вялікі гасцінец. Там будуць адлюстраваны самыя яркія моманты фестывалю за час існавання і артысты, чые імёны звязаны з ім. Акрамя гэтага, з мэтай папулярызацыі беларускага слова і знаёмства з беларускай культурай у нас будзе рэалізоўвацца праект «Роднае слова». На вуліцах горада з'явяцца каляровыя макеты і афішы, якія прадэманструюць каларыт і багацце беларускай мовы. Фестываль праходзіць у Год народнага адзінства, таму наша мэта — злучыць людзей розных узростаў. Будуць працаваць усемагчымыя зоны адпачынку, творчасці. Тут жа размесцяцца пляцоўкі тэатральнага і цыркавога мастацтва, фотавыстаўка і многае іншае. А завяршыць работу гэтых зон плануем буйным флэшмобам «Танцавальны мікс». Я перакананна, што юбілейны фестываль беларускай песні і паэзіі стане сапраўдным святам і задаволіць самыя розныя густы.

**Алена ДРАПКО.**

З нагоды

# Адшукаць вобраз свайго Багдановіча

## Самыя цікавыя экспанаты юбілейнай экспазіцыі



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Літаратурны музей Максіма Багдановіча 1 красавіка адзначыў 40-гадовы юбілей з дня стварэння і пачатку сваёй дзейнасці. Да гэтай даты прымеркавана і мастацка-дакументальная выстава «40/40», дзе прадстаўлены знакавыя прадметы з фонду Багдановіча за перыяд існавання з 1981 да 2021 год.**

— Гэтая выстаўка — не толькі прадметы, але яшчэ і людзі, якія спрычыніліся да яе збору: родзічы Максіма Багдановіча, сябры нашага музея, навукоўцы і даследчыкі, якія вялікую частку жыцця прысвяцілі геніяльнаму паэту і спадчыне, з ім звязанай. Таму хацелася б усім, хто працаваў на працягу сарака гадоў у нашым музеі, хто перадаваў прадметы ў нашы фонды, хто ўдзельнічаў у нашых імпрэзах, шчыра падзякаваць. Мы будзем старацца і далей працаваць так, каб не было сорамна глядзець у будучыню, — зазначыў падчас адкрыцця выстаўкі **загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл БАРАНОЎСКІ.**

Асаблівай разынкай можна лічыць мастацкае ўвасабленне выставачнага праекта ў выглядзе каляндарных лісткоў. Так, напрыклад, першы (ён нават зарэгістраваны пад гэтым нумарам у кнізе паступленняў) экспанат — гэта **кніга аўтарства Ніны Ватацы «Песня Максіма».**

— Ніна Барысаўна была для музейных супрацоўнікаў, як і ўвогуле для ўсіх даследчыкаў біяграфіі, творчасці, жыцця Багдановіча, вялікім дарадцам. Яна з 1957 года пачала карпатлівую працу па зборы інфармацыі і выдала першыя кнігі з пералікам публікацый па Багдановічу. А ў кніжцы «Песня Максіма» пад адной вокладкай сабрана шэсць артыкулаў Ніны Барысаўны, — расказвае **навуковы супрацоўнік навукова-асветніцкага аддзела Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Валянціна КАРОТКІНА.** — У кнізе ёсць дароўны надпіс: «Літаратурнаму музею Максіма Багдановіча», і ля нас гэтая рэч вельмі важная. З яе вядуць адлік нашы фондавыя зборы.

А вось з даты 1 красавіка бярэ адлік гісторыя дзейнасці музея, калі з'явіўся **загад за подпісам Міхаіла ПАЗНЯКОВА,** што ён прыступіў да работы ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча ў якасці дырэктара.

Хоць выстаўка і задумвалася як прэзентацыя 40 прадметаў, але можна ўбачыць тут і 41-ы — **альбом «Замалёўкі горада Яраслаўля»,** які належаў мастаку Барысу Аракчэеву. Артэфакт у фонды паступіў 4 лютага 2021 года. А значыць, гісторыя працягваецца, і наперадзе — новыя адкрыцці. На сёння агульны збор фонду Літаратурнага музея Максіма Багдановіча складае 20 777 прадметаў.

Адбіраць з такой колькасці 40 экспанатаў, вядома, было складана, аднак у выніку атрымаліся вельмі сімвалічныя і яркія акцэнты. Як прыклад, летась, у юбілейны год Уладзіміра Караткевіча, у фонды музея трапіла **кніга Мікалая Грынчыка «Максім Багдановіч і народная паэзія» (1963) з аўтографам Уладзіміра Сямёнавіча**. Можна знайсці на выстаўцы таксама і рэчы, якія перадалі ў музейную ўстанову родныя паэта. Такім з'яўляецца ручнік, які належаў родзічам Максіма Багдановіча па бацькоўскай лініі, перададзены Вольгай Дашкоўскай у 2012 годзе.

За кожным прадметам — гісторыя. Напрыклад, можна ўбачыць **гэбель бацькі паэта Адама Ягоравіча,** паступленне якога датуецца 1988 годам. Альбо побач **шкатулка** (з'явілася ў фондзе ў 1987 годзе), якая захоўвала ў свой час таямніцы сям'і, бо ў ёй зберагалі сямейныя дакументы. Яна належала цётцы Максіма Багдановіча Магдаліне Ягораўне, а пасля перайшла да яе дачкі Ганны Гапановіч, а ў музей трапіла ўжо ад яе дачкі, Кацярыны Сіліваноўскай.

Цікавыя падрабязнасці захоўваюць і **аўтографы самога Максіма Багдановіча** (варта ўдакладніць, што аўтографам у музеях лічыцца не толькі подпіс чалавека, але ўсё напісанае рукой аўтара). На выстаўцы прадстаўлены дзве такія рэчы: зборнік «Вянок» 1913 года з дароўным надпісам цёткі (з 1991 года ў фондах) і фотакартка, якую ў музей перадалі з Дзяржаўнага мемарыяльнага музея Янкі Купалы ў 1992 годзе, з нагоды святкавання 100-гадовага юбілею Багдановіча. Фотаздымак 1909 года, на ім паэт яшчэ гімназіст. Лічыцца, што яго Максім Багдановіч падарыў Сяргею Палуяну, з якім у яго было завочнае сяброўства. На фотаздымку нават пазначана дата «3 лютага, 1910 года» і адзін з вершаў «Я нядужы, бяскрылы паэт...»

Праўда, даследчыкам вядома яшчэ адна гісторыя з такім жа партрэтам і тым самым вершам. Па ўспамінах бацькі паэта, гэта было прысвячэнне паненцы Кіціцынай, з якой Максім пазнаёміўся падчас канікул у Крыме. Аднак той фотаздымак Адам Ягоравіч у свой час аддаў разам з архівам сына ў Акадэмію навук, і там яго след згубіўся.

Калі гаварыць пра жанчын, якія маюць дачыненне да жыцця класіка, то на выстаўцы, напрыклад, змешчаны **нататнік Зоські Верас,** датаваны 1908—1917 гадамі. Зоська Верас у свой час была як жывая крыніца памяці: да яе ездзілі літаратары, навукоўцы, журналісты, бо яна шмат ведала і магла расказаць пра Максіма Багдановіча, хоць і была шчодрай на крытыку ў адрас даследчыкаў і сваіх сучаснікаў. Дзякуючы ёй даследчыкі маюць досыць падрабязнае ўяўленне пра побыт паэта ў Мінску. У самім нататнічку ёсць малюнкі, вершы, пазнакі — сведкі часу і думак.

Можна сярод экспанатаў заўважыць і некалькі жывапісных работ, дзе **карціна Сулкоўскага «Пакой у доме на вуліцы Малагеоргіеўскай»** (там Багдановіч кватараваў зімой 1916—1917 года) альбо **работа Агуновіча «Яраслаўль. Дом Максіма Багдановіча».** Адна з цікавых рэчаў — **кніга «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю»,** выдадзеная ў Пецярбургу пад рэдакцыяй этнографа Паўла Шэйна, з якім вёў перапіску Адам Ягоравіч Багдановіч, дасылаючы сабраныя ім казкі, абрады, прыпеўкі. Другі том выйшаў у Пецярбургу ў 1893 годзе, і ў музей яго перадаў унук Янкі Брыля ў 2019 годзе...

Дарэчы, у планах арганізатараў — зладзіць некалькі экскурсій, агульных альбо тэматычных, у межах выстаўкі. Таму спяшайцеся наведаць і сачыце за навінамі на сайце ўстановы, каб скласці для сябе вобраз свайго Максіма Багдановіча.

**Алена ДРАПКО.**

Вернісаж

# Калі сыходзіць усё, застаецца мастацтва:

## выстава-амаж Захару Кудзіну

**Захар Кудзін працаваў у плыні сучаснага мастацтва. Штогод удзельнічаў у выставе «Восеньскі салон», якая служыць пляцоўкай для дыялогу паміж мастаком і пакупніком, дзе яго карціны заўсёды заўважалі. Але большасць ведае Захара дзякуючы дакументальнай стужцы Максіма Шведа «Чыстае мастацтва». Гэта фільм аб цэнзуры і самацэнзуры, аб горадзе і яго жыхарах, аб поглядзе на сусвет. У «Чыстым мастацтве» Захар іграе самога сябе — мастака.**

Захар Кудзін сышоў з жыцця вельмі трагічна і заўчасна, калі перад ім толькі адкрывалася дарога да славы. Напэўна, яшчэ доўга будуць узнікаць гіпотэзы наконт яго сыходу. А тое, што прызнанне ў яго ёсць, сведчыць факт, што з нядаўняга часу работа майстра знаходзіцца ў фондзе Нацыянальнага мастацкага музея. А 27 сакавіка, у дзень 35-годдзя Захара Кудзіна, у Палацы мастацтваў адкрылася выстава, прысвечаная яго творчасці і асобе.

Выстава-амаж адлюстроўвае і стаўленне іншых мастакоў да Захара, і тое, якімі сродкамі можна захаваць памяць аб творцы. Работы для экспазіцыі збіраліся або ствараліся адмыслова ў памяць аб Захары. Цікава, што, калі трапляеш сюды, адразу адчуваеш дух бунтарства, юнацтва і свежасці погляду. Гэтым пачуццям спрыяюць не толькі яркія колеры работ, але і іх асноўны пасыл. У гэтым сэнсе найбольш яскравым прыкладам служаць работы Уладзіміра Грамовіча «Бітыя краявіды». На серыі паштовак «Мінск сучасны» чорным маркерам намаляваны зігзагі, якія разрываюць, быццам бы графіці на сценах, звыклыя для нас краявіды.



Малюнкі, прысвечаныя Захару пры яго жыцці, не падпадалі пад адбор. Усё, што было прывезена, куратары паспрабавалі размясціць у выставачнай прасторы. Сама яе кампазіцыя атрымалася цікавай: цэнтральная частка залы адведзена пад раннія работы самога Захара і яго сяброў студэнцкіх гадоў. Побач з уваходам вісяць малюнкі тых, хто меў вельмі блізкія стасункі з Кудзіным. Тут вы можаце пабачыць работы і Адама Глобуса, і Анфісы Лано. Таксама ў прасторы адведзена месца маладым мастакам, на творчасць якіх паўплываў Захар.

Выстава-амаж завершыцца 11 красавіка. Але гэта толькі частка вялікага творчага праекта, у межах якога запланавана шмат мерапрыемстваў. Так, ужо ў гэтую суботу, 10 красавіка, арганізатары запрашаюць на куратарскую лекцыю па выставе. Абяцаюць, што дзякуючы лекцыі куратараў Ірыны Кандрацэнкі і Вольгі Мжэльскай вы ўбачыце экспазіцыю пад зусім іншым ракурсам. Ахвотна верым гэтым словам.

**Арына КАРПОВІЧ.**

Спадчына

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЗАВЯШЧАННЕ

**На працягу года будзе завершаны буйны праект па выданні першага навукова-каментаванага збору твораў Янкі Брыля. У Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі былі прэзентаваны першыя шэсць тамоў.**

Пры рабоце над гэтым праектам былі ўлічаны заўвагі класіка. Часта пісьменнікі выказваюць свае пажаданні і прапановы датычна такіх выданняў, але Янка Брыль пакінуў літаратурнае завяшчанне з «няспешна прадуманымі заўвагамі» (гэта цытата самого майстра мастацкага слова).Такі выпадак унікальны ў сусветнай літаратуры. Дарэчы, само літаратурнае завяшчанне змешчана ў першым томе збору твораў.

У першы і другі том увайшлі апавяданні Янкі Брыля, у трэці і чацвёрты — аповесці, у пяты — адзіны раман класіка «Птушкі і гнёзды». Шосты і сёмы складаюць літаратурныя мініяцюры — менавіта іх сам Іван Антонавіч і літаратурныя крытыкі лічаць адным з самых каштоўных набыткаў. Упершыню выдаўцы падпарадкаваліся творчай волі пісьменніка і змясцілі літаратурныя мініяцюры адным тэкстам.

Падчас прэзентацыі дачка Янкі Брыля Наталля Семашкевіч расказала, што бацька добра паклапаціўся пра захаванне сваёй спадчыны, упарадкаваў яе і яшчэ ў дзевяностыя гады пачаў падаваць дакументы ў архівы. Калі яго не стала, родныя знайшлі папку, падпісаную «Завяшчанне», дзе былі распісаны крокі, якія трэба зрабіць нашчадкам. Так, пісьменнік прасіў здаць у архівы свае кнігі ад першай за 1946 год да апошняй (кніга «Парастак» выйшла ў 2006 годзе за два тыдні да таго, як пісьменніка не стала), а таксама перадаць дзённікі і ўспаміны. Сям'я выканала наказ — перадала дакументы ў аддзел рэдкіх рукапісаў коласаўскай бібліятэкі. Для новага праекта сям'я дапамагла падабраць фотаздымкі.

«Калі ўлічыць, што бацька быў дзясятым у сям'і, колькасць сваякоў нямераная, і разабрацца ў іх было вельмі складана нават нам, не тое, што даследчыкам. Так, тры Шуры згадваецца ў дакументах альбо я дакладна ведаю тры Андрэі Брылі», — дзеліцца Наталля Іванаўна. Яна заўважае, што Янка Брыль быў вельмі акуратным у папяровых справах. Яго фотаархіў раскладзены па падпісаных папках. Напрыклад, у папцы «Мае падарожжы» здымкі, зробленыя ў розных краінах, захоўваліся ў асобных канвертах.

Сёмы том збору Янкі Брыля ўжо знаходзіцца ў выдавецтве. У восьмым будуць змешчаны нарысы і літаратурныя партрэты, у дзявятым — літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, інтэрв'ю. А завершыць выданне том з эпісталярнай спадчынай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Гасцёўня

# «Мы, як алхімікі, шукаем формулу твора на беларускай мове»:

## інтэрв'ю з пісьменніцай Алёнай Беланожкай

**Пісьменніца Алёна Беланожка жыве ў Магілёве і працуе мастацкім кіраўніком у абласной філармоніі. Нядаўна ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшла яе аповесць «Зорка Ракгіхархі». Падчас знаёмства з пісьменніцай вельмі складана ўявіць, як у яе атрымліваецца жыць у такім хуткім тэмпе: ствараць апавяданні, вершы, песні; распрацоўваць музычныя мерапрыемствы, удзельнічаць у круглых сталах ды тэлеперадачах. Алёна распавяла аб сваім творчым бэкграўндзе, падзялілася асноўнымі планамі і выказалася наконт стану сучаснай беларускай літаратуры.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Вы былі госцяй тэлеперадачы «Дыяблог», дзе сказалі аб тым, што з'яўляецеся спецыялістам па фальклоры. Таксама ў вас ёсць твор «Зарні Ані», заснаваны на комі-пярмяцкай міфалогіі... Дзе вы набывалі адукацыю?***

— Сказаць, што ў маім дыпломе так і напісана — «Спецыяліст па фальклоры», вядома, нельга. Я вучылася ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і, скончыўшы навучанне, стала рэжысёрам абрадаў і свят. Мы вывучалі традыцыйную мастацкую культуру беларусаў. Я шчыра захапілася, пачала набываць адпаведную літаратуру, звязаную не толькі з культурай Беларусі, але і з культурай нашых паўднёвых і ўсходніх суседзяў. Вывучала сімволіку, семантыку... Пазней, калі ўладкавалася на работу ў Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы, атрымала шанец наведаць розныя куточкі Магілёўскай вобласці і паглядзець, у якім стане народная творчасць Магілёўшчыны знаходзіцца ў дваццаць першым стагоддзі, як яна развіваецца, трансфармуецца, як адказвае на выклікі часу.

Твор «Зарні Ані» — фантастычнае апавяданне, мастацкая перапрацоўка ўяўленняў пра «Залатую бабу», і прыдумкі ў ім значна больш, чым уласна міфалагічнага кантэксту. Мяне проста ўразіў гэты вобраз, асноўную частку твора дарабіла фантазія.

***— Якую ролю іграюць міфы ў вашых творах?***

— Вялікую. Як, напэўна, і ва ўсіх пісьменнікаў, хто піша ў фантастычным жанры. Міфы — вялікая крыніца натхнення. Наколькі глыбока мы іх перапрацоўваем — залежыць ад задачы, якую перад сабой ставім. Іншы раз трэба напісаць захапляльны, дынамічны сюжэт. А іншы раз — стварыць атмасферны твор, у якім залішняя сюжэтная нагрузка будзе разбураць тую самую атмасферу. Напрыклад, «Казкі неба і акіяна», надрукаваныя ў часопісе «Маладосць», хоць і маюць адсылкі да палінезійскай міфалогіі, але асноўная мая задача была — паказаць прыгожую, таямнічую, сапраўды казачную атмасферу ўсходняй Акіяніі. Свет, які адрозніваецца ад нашага.

***— Які ўплыў на вас як на аўтара аказаў Магілёў?***

— Гэтае месца, дзе я нарадзілася, з якім звязаны мой лёс. Я напісала не адну песню, не адзін верш пра Магілёў і Магілёўшчыну, ствараю сцэнарыі свят і відовішчаў, фестываляў, якія праходзяць у Магілёўскай вобласці. Зараз працую над творам для падлеткаў, заснаваным на паданні пра Машэку. Думаю, што мой горад абавязкова натхніць мяне і на вялікія празаічныя творы.

***— У адным са сваіх інтэрв'ю вы сказалі: «З прозай і драматургіяй сітуацыя, мякка кажучы, тужлівая. Тут не тое, што няма канкурэнцыі. Тут некаторыя нішы зусім не занятыя». Прайшло амаль дзесяць гадоў. Ці змянілася ваша меркаванне на гэты конт? І калі змянілася, то як?***

— Драматургаў у нас, і праўда, небагата. Кінасцэнарыстаў, стваральнікаў тэатральных п'ес можна пералічыць па пальцах. На жаль, мы не чуем новых гучных імёнаў. Магчыма, яны ёсць, але мы пра іх нічога не ведаем. Згадак у шырокай прэсе няма — хіба што ў профільнай, але для простага чалавека гэта таямніца. Для большасці людзей, чытачоў вялікая загадка, ці ёсць у нас сучасныя драматургі? Ці выдаюцца зборнікі п'ес, адрасаваных дзіцячай аўдыторыі? А для самадзейных тэатраў? Дзе ім браць сучасны матэрыял? Напэўна, гэта звязана з тым, што сёння сцэнарыст і рэжысёр працуюць у шчыльным тандэме, новыя п'есы, пастаноўкі калі ствараюцца, то робяцца адразу пад умовы сцэнічнай пляцоўкі, і вядома, што ў друку яны не з'яўляюцца. Але ўсё-ткі я ўпэўнена, што калі аўтары напішуць добрыя, якасныя п'есы, прынясуць у рэдакцыі — то з'явяцца новыя зборнікі, ды не адзін-два, а будзе заснавана цэлая серыя, адкрыты новыя імёны. І таксама спадзяюся, што ў нас з'явіцца больш сатырыкаў, фельетаністаў. Можа быць, не зараз. Не адразу. Але ўсё будзе. Я аптымістка.

***— Як вы ставіцеся да падзелу літаратуры на мужчынскую і жаночую?***

— Я думаю так: каму зручна дзяліць літаратуру, каб было прасцей абіраць для сябе аўтараў, прасцей крытыкаваць — хай дзеляць. У гэтым ёсць прыемны элемент гульні і спаборніцтва.

***— Якія станоўчыя тэндэнцыі вы бачыце ў развіцці жаночай літаратуры? У прыватнасці сярод беларускіх аўтарак?***

— Гэта пытанне да крытыкаў, а не да аўтара. Мастак слова многа працуе, цяпер у мяне значна меней часу на тое, каб пісаць — не тое што маніторыць стан нашай літаратуры. Мы кожны робім у сваім кірунку тое, што можам, на што хапае сіл. Думаю, ні для кога не сакрэт, што жыць толькі з ганарараў за мастацкую літаратуру сёння немагчыма. Мы, як алхімікі, шукаем формулу твора на беларускай мове — любога жанру, — які хутка разляціцца агромністым тыражом, будзе мець вялікі поспех, дасць фінансавую свабоду аўтару і дазволіць займацца толькі літаратурай. Я, напрыклад, гэтую формулу пакуль не знайшла. Магчыма, нехта зараз дапісвае апошнія радкі такога твора. Час пакажа.

***— Вы ўжо не адзін раз казалі аб неабходнасці стварэння ўмоў для прасоўвання аўтараў і іх твораў, то-бок гэта з'яўленне літаратурных агентаў, больш актыўная работа выдавецтваў і г. д. Як вы лічыце, ці палепшылася сітуацыя за апошнія гады?***

— Думаю, што ёсць станоўчыя тэндэнцыі. Выдавецтвы актыўней прасоўваюць сваіх аўтараў. Літаратурны агент — па-ранейшаму вялікая мара кожнага пісьменніка.

***— А што датычыцца інстытута крытыкі? Вы як аўтар адчуваеце дастатковасць або, наадварот, недастатковасць прафесійнага водгуку на вашы работы?***

— Цяжка пра гэта казаць, калі кнігі выходзяць раз на некалькі гадоў. Я не самы прадукцыйны аўтар, а прычына — вышэй. У аглядах часопісаў, якія з'яўляюцца ў газетах, іншым разам бачу сваё прозвішча. Адзін-два-тры сказы — дзякуй крытыкам, што мяне згадваюць, для мяне гэта вялікі падарунак, вялікі гонар. Але я думаю так: калі мяне не крытыкуюць — значыць, тое, што я раблю, крытыкам не цікава. Аповесць «Зорка Ракгіхархі», якая выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», пакуль водгукаў не мае. Ні станоўчых, ні адмоўных. Буду працаваць. Магчыма, на будучыя творы крытыкі звернуць увагу.

***— Вы мастацкі кіраўнік Магілёўскай абласной філармоніі. Распавядзіце, калі ласка, што ўваходзіць у вашы абавязкі? Над чым вы зараз працуеце?***

— Як мастацкі кіраўнік, я вяду рэпертуарную палітыку ўстановы. Зараз мы працуем над некалькімі праектамі: музычным кавер-праектам «Аднойчы ў кафэ «Смайл», які будзе прадстаўлены аўдыторыі 10 чэрвеня, над музычнымі праграмамі ў рамках свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое пройдзе 10 ліпеня, мюзіклам «Вянок на вадзе», дзіцячай музычнай казкай «Барбос і Мурка шукаюць гаспадара», музычна-пазнавальнымі праграмамі з цыкла «Казкі і песні роднай зямлі», адрасаванымі дзіцячай аўдыторыі, — у іх мы расказваем маленькім гледачам пра беларускія святы і звычаі, знаёмім з народнымі гульнямі, песнямі, казкамі. Гэта асноўнае, над чым мы цяпер працуем, але ў нас яшчэ шмат праектаў — канцэртных праграм, вялікіх свят, а восенню ўсіх чакае міжнародны музычны фестываль «Залаты шлягер — 2021» — будзем рады бачыць на канцэртах!

***— А калі казаць аб літаратуры: над чым працуеце і што плануеце зрабіць у найбліжэйшы час?***

— Дзіцячая прыгодніцкая аповесць «Скарб Машэкі» і зборнік фантастычных апавяданняў. Таксама вельмі спадзяюся, што ў мяне атрымаецца выдаць паэму індыйскага паэта Джаядэвы «Гітагавінда», напісаную на санскрыце, у перакладзе на беларускую мову. Вельмі хачу, каб наш чытач пазнаёміўся з гэтым фантастычна прыгожым творам! Джаядэва па-беларуску — гэта вельмі незвычайна і цікава. Мноства адсылак да індыйскай міфалогіі, таму з каментарыямі, з прадмовай. Увогуле, «Гітагавінда» — тэма для асобнай гутаркі. Я спадзяюся, што вядомы індолаг, прафесар Аляксандр Якаўлевіч Сыркін убачыць гэтую кнігу. За натхненне я павінна падзякаваць гэтаму неверагодна таленавітаму чалавеку, бліскучаму вучонаму, які пераклаў шмат помнікаў старажытнаіндыйскай літаратуры.

**Арына КАРПОВІЧ.**

K@нтыненты

# АПОШНІ ЗВАНОК

## Чаму сыходзяць з дыстанцыі вытворцы культавых мабільнікаў?

**Днямі сусветна вядомы паўднёвакарэйскі вытворца спажывецкай электронікі LG Electronics заявіў, што закрывае падраздзяленне па вытворчасці смартфонаў. Гэтае рашэнне ўжо ўхваліў савет дырэктараў кампаніі. LG прыняла стратэгічнае рашэнне сысці «з неверагодна канкурэнтнага рынку» смартфонаў і засяродзіць намаганні на такіх перспектыўных сферах, як вытворчасць дэталяў для электрамабіляў, тэхналогіі разумнага дома, робататэхніка, штучны інтэлект, рашэнні b2b (так званы бізнес для бізнесу), а таксама платформы і сэрвісы, паведаміў ixbt.com. Астаткі ўжо выпушчаных смартфонаў кампанія працягне прадаваць, а таксама на працягу пэўнага перыяду будзе аказваць сэрвісную падтрымку і абнаўленне праграмнага забеспячэння тым, хто ўжо купіў не тэлефоны. Чаму сыходзяць з дыстанцыі вытворцы культавых тэлефонаў і якім чынам у бліжэйшы час будзе перафарматаваны сусветны «мабільны» рынак?**

### Канец эры Nokia

Яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя найбуйнейшыя сусветныя кампаніі жылі ў сярэднім 60 гадоў. Сёння гэтая велічыня скарацілася ўтрая. Адметныя рысы эпохі Чацвёртай прамысловай рэвалюцыі — жорсткая канкурэнцыя і дынамічная зменлівасць за кошт хуткага развіцця тэхналогій. Згодна з даследаваннямі, да 2023-га кампаніі будуць штогод выдаткоўваць на лічбавую трансфармацыю 2,3 трыльёна долараў. Ва ўмовах беспералыннай гонкі сённяшнія лідары маюць усе шанцы пайсці на дно ўжо заўтра, і такіх прыкладаў назапасілася дастаткова. Дэсяцць гадоў таму свет стаў сведкам краху цэлага шэрагу найбуйнейшых гульцоў мабільнай індустрыі, адзначыла lenta.ru.

Адзін з яскравых прыкладаў — вопыт кампаніі Nokia. Яе гісторыя пачалася ў 1865-м з невялікай папяровай фабрыкі, заснаванай фінскім горным інжынерам Фрэдэрыкам Ідэстамам. Ужо праз некалькі дзесяцігоддзяў кампанія вяла некалькі кірункаў дзейнасці, займаючыся перапрацоўкай драўніны, выпрацоўкай электраэнергіі, вытворчасцю кабеляў, гумовых вырабаў і электронікі. Да сярэдзіны мінулага стагоддзя Nokia мела ўжо дзясяткі розных вытворчасцяў.

Аднак з другой паловы 1970-х Nokia засяродзілася пераважна на рабоце з электратэхнікай і ў гэты ж перыяд заявіла пра сябе як да перадавой кампаніі ў галіне канструявання тэлефонаў. Умелае кіраўніцтва і абачлівая рэакцыя на найменшыя змяненні рынку дазволілі кампаніі хутка завяваць лідзіруючыя пазіцыі ў сегменце. Nokia задавала трэнды: гульнявая мадэль N-Gage была рэвалюцыйнай для свайго часу, а люксавая 8800 лічылася знакам прэстыжу. У 1997 годзе было абвешчана аб 120-працэнтным павелічэнні прыбытку, і да 2000-га кампанія стала абсалютным лідарам сярод тэлекамунікацыйных кампаній свету.

Фінскі гігант дамінаваў на рынку мабільных тэлефонаў да 2007 года, прадаючы больш чым 250 мільёнаў тэлефонаў у год і нашмат апярэджваючы канкурэнтаў. Абароты кампаніі на ўздыме былі роўныя адной пятай ВУП Фінляндыі, а сама яна ацэньвалася прыкладна ў 200 мільярдаў долараў — больш, чым аўтамабільныя кампаніі Mercedes-Benz і Toyota разам узятыя. Лідарства Nokia на рынку сур'ёзна падарваў выхад першага iPhone, а пасля і смартфонаў на мабільнай аперацыйнай сістэме ад кампаніі Google. З прыходам iOS і Android тэлефоны фінскай кампаніі на маральна састарэлай аперацыйнай сістэме Symbian пачалі адчувальна здаваць пазіцыі. Падзенне было відавочным: калі на момант прэм'еры iPhone ў 2007 годзе доля фінскай кампаніі на рынку смартфонаў складала амаль 50 працэнтаў, то да канца 2012-га яна ледзь дацягвала да чатырох.

У верасні 2013 года Nokia сышла з рынку мабільных тэлефонаў, прадаўшы сваё падраздзяленне Microsoft, і засяродзілася на распрацоўцы сотавых сетак пятага пакалення. І хоць сёння легендарная кампанія — адзін з буйных гульцоў на рынку 5G і вядзе ўзначаліць развіццё сетак 6G у Еўропе, да ранейшага поспеху ёй далёка.

### Квэст для Motorola

Прыклад Nokia — наглядны прыклад таго, наколькі зменлівы рынак высокатэхналагічных тавараў і што бывае з тымі, хто хоць ненадоўга заззяецца. Падобны лёс напаткаў яшчэ аднаго ў мінулым важкага гульца мабільнай індустрыі — Motorola, з той толькі розніцай, што гэтая амерыканская кампанія пратрымалася на п'едэстале вытворцы самых жаданых тэлефонаў значна менш за Nokia. Хоць менавіта Motorola, па сутнасці, вынайшла мабільны тэлефон. Motorola DynaTAC 8000X — першы ў свеце мабільнік — важыў 1,15 кілаграма і зараджаўся больш за 10 гадзін. Ён атрымаў сертыфікат Федэральнай камісіі па сувязі ЗША ў верасні 1983 года, згадала lenta.ru.



Менавіта з гэтай мадэлі пачалася «гонка ўзбраенняў» на рынку сотавых тэлефонаў, з якой Motorola не наканавана было выйсці пераможцай. Па сутнасці, у кампаніі былі толькі два зорныя моманты на глабальным рынку. Спачатку — у 1990-х, калі мабільныя тэлефоны яшчэ лічыліся тэхналагічным цудам і «раскладанкі» Motorola нейкі час былі стандартам мабільніка. Культавая Motorola StarTac мільгала практычна ва ўсіх галівудскіх фільмах таго часу. У 2000-х гэта ўдалося паўтарыць з другой мадэллю — RAZR V3, якая стала культавай. Адначасова з гэтым Motorola распрацоўвала нядрэнныя мадэлі: напрыклад, E398 лічыўся выдатным музычным тэлефонам. У цэлым справы ішлі нядрэнна, пакуль топ-менеджмент кампаніі не пралічыўся з выбарам партнёра.

Тагачасны выканаўчы дырэктар Motorola Эд Зандэр хацеў удыхнуць новае жыццё ў прадукцыю кампаніі. Патрабаваўся свежы струмень, і такім штуршком, на думку Зандэра, магло стаць супрацоўніцтва з якой-небудзь нязвыклай для рынку тэлефонаў кампаніяй — напрыклад, Apple. І ў 2005 годзе, за два гады да з'яўлення iPhone, кампаніі анансавалі iTunes-фон Motorola ROKR E1. Па сутнасці, гэта быў той жа E398, софт якога быў інтэграваны ў краму музыкі iTunes. Аднак Motorola не атрымала эксклюзіўны правоў на ўкараненне iTunes, затое сутыкнулася з цэлым шэрагам праблем і абмежаванняў. У выніку ROKR E1 так і не набыла папулярнасці ў пакупнікоў, а супрацоўніцтва паміж брэндамі вельмі хутка скончылася.

Motorola паспела выпусціць яшчэ некалькі цікавых смартфонаў на пачатку развіцця Android, якія да нашага рынку так і не дайшлі, ды і ў цэлым не аказалі на пакупнікоў адмысловага ўражання. У 2011 годзе глабальная Motorola падзялілася на два падраздзяленні: Mobility і Solutions. Motorola Mobility была набыта Google за 12,5 мільярда долараў, а праз тры гады яе выкупіла Lenovo ў чатыры разы танней — за $2,9 млрд. Другая частка — Motorola Solutions — займаецца тэлекамунікацыямі і час ад часу прадае свае падраздзяленні іншым кампаніям. У 2019-м яе прыбытак склаў 268 мільярдаў долараў, што ў чатыры з паловай разы менш, чым у 2014-м.

### Аўфідэрзэйн, Siemens

У пачатку XXI стагоддзя прабелмы на рынку мабільных прылад дагналі нават педантычных немцаў: у кастрычніку 2005-га кіраўніцтва канцэрна Siemens AG вырашыла завяршыць вытворчасць тэлефонаў і выставіла мабільнае падраздзяленне на продаж. З тых часоў тэлефоны Siemens спынілі сваё існаванне, а актывы кампаніі набыла тайваньская BenQ. Аднак новаму ўладальніку не ўдалося выправіць становішча. Літаральна праз год пасля паглынання актываў Siemens у BenQ заявілі, што вытворчасць сотавых з немецкага «радаводу» пакрываецца для кампаніі сур'ёзнымі стратамі. Вынікам гэтага стала хуткая адмова ад маркі BenQ-Siemens і вытворчасці тэлефонаў наогул.

Тым не менш у канцы 1990-х — пачатку 2000-х мабільнікі Siemens былі сярод самых папулярных кнопкавых GSM-тэлефонаў. Тады тэхнагігант не апасаўся эксперыментаваць з дызайнам і прыдумляў цікавыя слайдары, «раскладанкі» і тэлефоны-бірулькі. Больш класічныя мадэлі Siemens — такія як C45, A50, MC60 — таксама заслужылі прызнанне карыстальнікаў і сталі народнымі хітамі.

У пазнейшых прыкладах з'явіліся праблемы з надзейнасцю і якасцю праграмнага забеспячэння. Прычынай гэтага, хутчэй за ўсё, стала тое, што кампанія перастала паспяваць за развіццём індустрыі, у выніку чаго на рынак выводзіліся сырыя прадукты. У 2003 годзе Siemens нават выпусціла адзін з першых у свеце смартфонаў — SX1, які працаваў на аперацыйнай сістэме Symbian. Але, на жаль, гэта стала пачаткам канца: усе далейшыя спробы кампаніі замацавацца ў перспектыўным сегменце правальваліся. Апошняя, 75-я, серыя не справілася з канкурэнцыяй — у першую чаргу са смартфонамі Sony Ericsson і Nokia, і да 2005-га мабільнае падраздзяленне Siemens стала стратным.

Нягледзячы на правал Siemens AG у мабільным бізнесе, сёння нямецкая кампанія выдатна адчувае сябе на рынках прамысловасці, ахове здароўя, камп'ютараў і энергетыкі. Кампанія робіць бытавую тэхніку, слыхавыя апараты і працуе над сістэмай «разумны дом». Гадавы абарот Siemens складае больш за 86,5 мільярда еўра. Яе мінулы канкурэнт на рынку сотавых тэлефонаў — шведская кампанія Ericsson — стала лідарам у сферы тэлекамунікацыйнага абсталявання і рашэнняў для аператараў сувязі.

### Выхад Tesla

Гісторыя мабільных тэлефонаў і смартфонаў кампаніі LG вельмі багатая і насычаная. Падраздзяленне LG Electronics, якое займаецца распрацоўкай і выпускам мабільнікаў, пачало дзейнасць у 2001-м. Брэнд хутка і ўпэўнена развіваўся, праз год пакаўскі экспарту тэлефонаў перавышалі 2,5 млн адзінак. Доўгія гады LG актыўна сапернічала з Samsung, Sony Ericsson (а пасля Sony), Nokia, Apple, не кажучы ўжо пра кітайскія маркі.

З 2009-га яна шчыльна занялася стварэннем прылад на AC Android і цэлых шэсць гадоў заставалася ў пярэдніх самых папулярных вытворцаў. Аднак пасля 2015-га паўднёвакарэйскі брэнд пачаў несці страты, прычым істотныя, і ніякія «рэанімацыйныя» меры не дапамагалі.

Пачынаючы з 2018-га ўсе, нават адданыя фанаты маркі, пачалі разумець: LG засталося нядоўга. Кампанія перастала «свяціцца» ў спісах папулярных вытворцаў, пастаянныя зазвы кіраўнікоў аб правалах продажаў у вялікіх стратах, выпуск недаасначаных мадэляў — стос праблем станавіўся ўсё большым. Зразумеўшы, што так далей працягвацца не можа, гендырэктар LG Квон Бонг-Сока паведаміў, што надышоў час альбо згортваць мабільнае падраздзяленне, альбо прадаваць яго, і адбудзецца гэта ў 2021 годзе.

З сыходам LG іншыя ўдзельнікі рынку смартфонаў атрымліваюць шанец павялічыць свае долі. На думку аналітыкаў, больш за ўсіх можа выйграць другі паўднёвакарэйскі гігант — Samsung Electronics. Такі прагноз выказалі спецыялісты SK Securities і Counterpoint Research. Ключавым рынкам у гэтых адносінах лічыцца рынак ЗША, дзе LG уваходзіць у тройку найбуйнейшых пастаўшчыкоў з доляй 10 %. У барацьбе за гэты смачны кавалак у Samsung ёсць перавага над Apple — выкарыстанне той жа аперацыйнай сістэмы Android.

Паўднёвакарэйскі гігант вярнуў сабе лідзіруючыя пазіцыі па продажах смартфонаў у лютым з 23,1% долі рынку. Паводле справаздачы Strategy Analytics, кампанія абышла Apple (22,2 %), якая займала першае месца ў чацвёртым квартале мінулага года, дзякуючы продажам серыі iPhone 12. Далей ў топ-5 — спрэс прадстаўнікі Паднябеснай. Xiaomi стала па аб'ёмах продажаў трэцім вытворцам смартфонаў у свеце: яе доля рынку 11,5 %. За ёй рушаць Vivo і OPPO з 10,6 % і 8,5 % адпаведна. Як вынікае з прагнозаў Gartner, сёлета на сусветным рынку будзе прададзена 1,5 мільярда смартфонаў — на 11,4 % больш, чым у мінулым годзе.

Чакаецца і з'яўленне новых глабальных гульцоў. У сетцы з'явіліся выявы патэнцыйнага смартфона Tesla, які праходзіць пад назвай Model Pi. Крыніцы паведамляюць, што ён ствараецца з выкарыстаннем унікальных тэхналогій. Напрыклад, смартфон Tesla зможа падключацца да высакахуткаснага спадарожнікавага інтэрнэту Starlink ад SpaceX, а хуткасць загрузкі даных будзе дасягаць 210 Мбіт/с. Акрамя таго, яго можна будзе выкарыстоўваць для майнінгу крыптавалюты Marscoin. Відавочна, што калі Ілан Маск выйдзе на рынак смартфонаў, гэта можа прывесці да істотных змен у індустрыі.

**Захар БУРАК.**

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Паспрабуйце ў імя сваіх асабістых інтарэсаў не закідваць працу. Наадварот, на гэтым тыдні варта асаблівую ўвагу звярнуць на кар'ерны рост, бо магчымы вельмі прывабныя прапановы і дасягненні, якія садзейнічаюць павышэнню пасады. Каб дамагчыся поспеху, трэба прааналізаваць сітуацыю і трымаць пад кантролем эмоцыі.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні непажадана гуляць у хованкі з выбраннікам: вы ўсё роўна прайграеце. Таемнае стане відавочным. Будзьце рэалістам у вырашэнні асабістых праблем, якія зваліліся на вас. Прызнанне заслуг дзелавымі партнёрамі і сябрамі стане для вас прыемным сюрпрызам. Зможаце паглядзець на многія рэчы па-новаму і ўбачыць тое, што раней не заўважалі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Вас падхопіць вецер перамен, прычым прыемных. І гэта закране ў першую чаргу асабістае жыццё. Напрыклад, вам зробяць прапанову рукі і сэрца або можна чакаць прыбыткаў у сямействе. Да таго ж з'явіцца шанц дамагчыся поспеху ў дзелавой і фінансавай сферах. Паспрабуйце не адкладваць важныя справы і рашэнні — бярыцеся за іх адразу. Гэта прамы шлях да мэты. Пазітыўны погляд на свет дазволіць з лёгкасцю спраўляцца нават з самымі складанымі задачамі.

**РАК.** У пачатку тыдня выкарыстоўвайце сустрэчу з кіраўніцтвам у сваіх мэтах, выкладзіце планы і ідэі — вашу ініцыятыву абавязкова падтрымаюць. У чацвер можна збегчы з работы крыху раней і адправіцца на спатканне — яно акажацца вельмі рамантычным. У выхадныя адпачніце ад мітусні і клопатаў, адчуйце смак жыцця.

**ЛЕЎ.** Надыходзіць цікавы тыдзень, калі можна актыўна адпачыць ды з задавальненнем працаваць. Энергія віруе, таму многае будзе атрымлівацца. Сітуацыя, магчыма, запатрабуе ўменне спраўляцца з дадатковай нагрузкай. Паспрабуйце пазнеанны гаварыць і больш слухаць. Калі не ўдасца пазбегнуць удзелу ў спрэчцы, старайцеся захоўваць нейтральную пазіцыю. Нядзеля — удалы дзень для паездак і пачатку падарожжаў.

**ДЗЕВА.** У паняздзелак можаце атрымаць інфармацыю, якую лепш захаваць у таямніцы. У аўторак гутарка з начальствам можа прайсці ў павышаным тоне, аднак вам удасца даказаць сваю праваты. На трывалае і доўгае супрацоўніцтва ні ў працы, ні ў асабістым жыцці цяпер не разлічвайце: усё мімалётна і досыць ілюзорна. Магчыма забліытацца і адносіны з раднёй.

**ШАЛІ.** Гэты тыдзень абяцае прынесці задавальненне ад вашых поспехаў, энергію, здароўе і поспех. У сераду любая справа будзе атрымлівацца і практычна любая мара можа спраўдзіцца, калі, вядома, для гэтага не прыйдзецца абмежаваць інтарэсы іншых людзей. У чацвер можа з'явіцца непераадольнае жаданне змяніць кола стасункаў, вялікая верагоднасць з'яўлення новых знаёмых, блізкіх вам па духу. У выхадныя накіруйце энергію на вырашэнне хатніх спраў і ўнутрысямейных праблем.

**СКАРПІЁН.** Рэкамендуецца больш часу правесці ў дастатку, карыстаючыся плёнам поспеху, дасягнутага раней. Зрэшты, новыя справы таксама абяцаюць салідны прыбытак. Ваша энергія і сабранасць дазволяць стварыць цуды. Шанцаванне па дробязях стане прычынай аптымістычнага настрою, што таксама вельмі садзейнічае працаздольнасці. Серада дасць магчымасць пакінуць многія сур'ёзныя праблемы ў мінулым. У вашым жыцці пачынаецца яркі і ўдалы перыяд.

**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні асабліва ярка праявіцца ваша мэтанакіраванасць. Лёгка будзе рэалізаваць творчыя задумы як у індывідуальнай, так і ў калектыўнай працы. Вынікоўмі станунць далёкія паездкі і камандзіроўкі. У чацвер і пятніцу праявіце крыху больш увагі і дабрыні да сваёй сям'і. У выхадныя атрымаеце сапраўднае задавальненне ад стасункаў з сябрамі.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні давядзецца сабрацца — ад вас спатрэбіцца стойкасць і цярпенне. Сябры засыпнцюь парадамі дыяметральна процілеглага зместу. Спрабавць іх прытрымлівацца, зразумела, не варта, але выслухаць можна: раптам праслізне і разумная думка. Будзьце адкрыты да перамен, не адмаўляйцеся ад новых магчымасцяў. Працоўныя подзвігі не застануцца незаўважанымі — атрымаеце адабрэнне з боку начальства. У пятніцу пажадана крытычна ацэньваць свае дзеянні і словы.

**ВАДАЛІЎ.** Тыдзень чакаецца надзвычай плённы, максімальна насычаны разнастайнымі падзеямі. Аднак рызыкуеце стаміцца ад зносін. Чым больш актыўнасці, больш рухомасці і больш гнуткасці вы праявіце, тым большага здолееце дамагчыся. Сябры і блізкія акажуцца нядрэннымі дарадцамі. Часткай работы можаце падзяліцца з калегамі. Больш аддавайце часу падрастаючаму пакаленню.

**РЫБЫ.** Вынікі працы змогуць падрадаваць і прынесці маральнае і матэрыяльнае задавальненне. Аднак паспрабуйце не вясязаць адносіны з дзелавымі партнёрамі і не спрачацца з начальствам. На сераду можна запланаваць сур'ёзную размову са старым сябрам — магчыма, вы даведаецеся штосьці важнае. Пятніца спрыяльная для даследаванняў, лекцый і майстар-класаў. Але самі ўстрымайцеся ад публічных выступленняў — трымайце ідэі і планы пры сабе. У суботу займіцеся паўсядзённымі справамі, завяршыце пачатае ў будні.

## Даты Падзеі Людзі

**10 КРАСАВІКА**

У краіне

**1886** год — нарадзіўся Мікалай Васільевіч Найдзёнаў, беларускі вучоны-заолаг, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар.

**1901** год — нарадзіўся Канстанцін Аляксандравіч Вараноўіч, удзельнік рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

**1921** год — нарадзіўся Дзмітрый Фёдаравіч Грачушкін, удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1944 г., пасмяротна).



У гэты ж дзень нарадзіўся Васіль Цімафеевіч Калмыкоў, беларускі вучоны-юрыст, кандыдат юрыдычных навук, прафесар, заслужаны юрыст Беларусі.

**1931** год — нарадзіўся Іван Пятровіч Чыгрын, беларускі літаратуразнаўца, крытык, паэт, кандыдат філалагічных навук.

**1946** год — нарадзіўся Уладзімір Ягоравіч Мацюшкоў, беларускі вучоны ў галіне лазернай тэхналогіі і мікраэлектронікі, доктар тэхнічных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1986) і Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000).

**1956** год — нарадзілася Тамара Васільеўна Амбросьева, беларускі вучоны ў галіне вірусалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар.

**1981** год — нарадзілася Анастасія Іванаўна Ляшкевіч, беларуская спартсменка (шатакан каратэ-до). Чэмпіёнка свету ў камандным ката (2002), бронзавы прызёр першынства Еўропы ў камандным ката (2002).

**1996** год — на тэрыторыі Беларусі здабыты першы алмаз.

**2001** год — рашэннем Вілейскага райвыканкама зацверджаны герб горада Вілейкі і Вілейскага раёна.

У гэты ж дзень у Гербавым матрыкуле Рэспублікі Беларусь зарэгістраваны герб і сцяг г. п. Брагін.

У свеце

**1906** год — быў абнародаваны царскі ўказ аб адмене катаргі і ссылкі на Сахалін.

**1926** год — у Маскве выйшаў у свет першы нумар часопіса «Савецкае фота».

**1946** год — нарадзілася Кацярына Казэлі, італьянская спявачка, актрыса і музычны прадзюсар. Была прэзідэнтам міланскага музычнага лэйбла «Sugar Music». У якасці прадзюсара адкрыла Андрэа Бачэлі і Элізу Тафолі.



**1981** год — адкрыта для падпісання Канвенцыя па забароне або абмежаванні прымянення канкрэтных відаў звычайнай зброі, якія могуць лічыцца тымі, якія наносяць празмерныя пашкоджанні або маюць невыбіральнае дзеянне. Уступіла ў сілу 2 снежня 1983 г.

Так гаварыў...

**ГЕНРЫ ШОУ:**

*«Прырода ніколі не памыляецца: калі яна нараджае дурня, значыць, яна гэтага хоча».*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.20 | 20.02 | 13.42 |
| Віцебск | 6.08 | 19.54 | 13.46 |
| Магілёў | 6.10 | 19.53 | 13.43 |
| Гомель | 6.10 | 19.46 | 13.36 |
| Гродна | 6.36 | 20.17 | 13.41 |
| Брэст | 6.39 | 20.15 | 13.36 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 4 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

*Пр. Іларыёна, Сцяпана, Яўстрата.*
*К. Малгажаты, Міхаліны, Барыса, Генрыха, Макара, Міхала.*



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +16..+18°С | КІЕЎ +13..+15°С | РЫГА +5..+7°С |
| ВІЛЬНЮС +16..+18°С | МАСКВА +13..+15°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +6..+8°С |

УСМІХНЕМСЯ

**— Кажуць, ты са сваім разышлася? Што здарылася?**
**— А ты змагла б жыць з чалавекам, які выпівае, паліць, лаецца матам ды яшчэ і бійца лезе?**
**— Не, вядома!**
**— Вось і ён не змог!**

— Доктар, у мяне штосьці ў баку коле.
— Гэта дабрыня, даверлівасць і спагадлівасць.
— У якім сэнсе?
— А яны заўсёды бокам выходзяць!

**— Малады чалавек, вы што, мяне клеіце?**
**— Каб вас клеіць, вас трэба спачатку абястлусціць!**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя на свае меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспл. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1034.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30
9 красавіка 2021 года.